**Мароз, М.** А верталёт – на ўсе жыццё / М. Мароз // Герой працы (Шуміліна). — 2005. — 15 лют. — С. 2.

## А ВЕРТАЛЁТ – НА ЎСЕ ЖЫЦЦЁ

### Аповед маці афганца А. М. Скобава Канстанціны Ульянаўны з вёскі Дубрава

Пайшоў дваццаць першы год, як няма з намі майго сына Анатоля. Ён загінуў у Афганістане. І сёння баліць, і сёння яшчэ згадваю яго, старэйшага ў сям'і.

Не хачу лішняга гаварыць пра сына як маці, аднак хочацца расказаць больш падрабязна пра яго, хочацца сказаць больш, чым пісалі пра яго ў раённай газеце і наогул у друку. Вось захоўваю раёнку з артыкулам «Нявыпітае шампанскае», які выйшаў два гады назад. Артыкул – пра нашу нявестку, якая і па сённяшні дзень не здрадзіла свайму мужу, адна паставіла на ногі цяпер ужо дарослых дачок і няньчыць унукаў. Нікому не расказвала, што пасля заканчэння Кардонскай школы Анатоль, відаць, добра не падумаўшы, рвануў у Віцебск вучыцца на токара. Прыехаў аднойчы дамоў і захоплена расказваў, што вытачыў на станку два пярсцёнкі і яшчэ дэталь да маёй швейнай машыны. А пасля гэтае захапленне такарнай справай неяк мінулася. Ці то нехта падга-варыў, ці сам надумаў паступаць у ваеннае вучылішча на верталётчыка. Так вось і звязаў свой лес з арміяй.

Пасля заканчэння вучылішча армейскі лес закінуў у Грузію, потым у Венгрыю і з-пад Ленінграда яго накіравалі для ваенных дзеянняў у Афганістан. Было трывожна, але ўсе мы з надзеяй чакалі, што Толя вернецца дамоў жывы. Верталёт, якім кіраваў сын, падбілі ворагі. Гэта было летам 84-га.

Нам пазванілі з Віцебска і папрасілі трымацца мужна, болем апяклі словы: «Анатоль Мікалаевіч Скобаў загінуў». Дарэчы, і другі мой сын Іван, таксама пасля школы адпрацаваўшы крыху слесарам, пайшоў як **і** старэйшы брат за верталётчыка. Таксама ваяваў у Афганістане, там з братам і сустракаўся. Іван выжыў, доўгі час яшчэ служыў у Забайкаллі.

Добра помню, як хавалі сына на Мазурынскіх могілках. Народу было шмат, прыязджалі на пахаванне Толевы сябры, таксама верталётчыкі. Адзін у развітальнай прамове прызнаўся: «Няма з намі Анатоля, цяпер чарга мая». Ён, відаць, меў на ўвазе, што паляціць у Афган замест загінуўшага сябра, а не нешта іншае, больш жахлівае. Загінуў і ён. Мы доўгі час трымалі сувязь з сям'ёй вось гэтага Сцяпана Млявага з Чашнікаў. Так што чужая зямля забірала нашых братоў і сыноў бязлітасна.

Сёння Анатолю ішоў бы пяцьдзесят пяты год. Згадзіцеся – малады яшчэ мужчына, аднак яго няма сярод нас. Затое ён пакінуў след і ў сваёй вайсковай часці, і ў сэрцах родных, і ў гісторыі Кардонскай школы, якую некалі заканчваў.

**Мікалай Мароз**